Источник: "Звязда" - 2025-01-22

## 22 СТУДЗЕНЯ Даты Падзеі Людзі

### У краіне

**1861** год — нарадзіўся (г. Магілёў) Уладзімір Піліпавіч Горын-Галкін, удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Расіі, філосаф-марксіст. У 1882 годзе за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях быў выключаны з Харкаўскага ветэрынарнага інстытута. Стварыў нарадавольскія гурткі ў Сімферопалі, Адэсе. У 1887 годзе быў арыштаваны і сасланы на дзесяць гадоў у Верхаянск. Удзельнік Сібірскага сацыял-дэмакратычнага саюза, член Саратаўскага камітэта РСДРП, працаваў у сацыял-дэмакратычных арганізацыях Растова-на-Доне, Баку, Тыфліса, Кутаісі. Супрацоўнічаў з газетай «Искра». Дэлегат II з'езда РСДРП (1903), бальшавік. Удзельнічаў у падрыхтоўцы і правядзенні Кастрычніцкага ўзброенага паўстання. Адзін з арганізатараў Народнага камітэта замежных спраў РСФСР. З 1918 года быў на ваенна-палітычнай і навукова-педагагічнай рабоце.



**1906** год — нарадзіўся (г. Мінск) Андрэй Александровіч, беларускі паэт, празаік, член-карэспандэнт НАН Беларусі. Адзін з арганізатараў літаратурнага аб'яднання «Маладняк». У 1929—1931 гадах — намеснік дырэктара Белдзяржкіно, у 1934—1937-м — намеснік старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. Аўтар паэтычных зборнікаў «Па беларускай маставой», «Празалоць», «Фабрыка смерці» і інш.

### У свеце

**1506** год — Папа Юлій II запрашае на службу ў Ватыкан швейцарскіх гвардзейцаў, якія з таго часу ахоўваюць папскую рэзідэнцыю.

**1788** год — нарадзіўся лорд Байран, англійскі паэт-рамантык. Паэмы Байрана больш аўтабіяграфічныя, чым сачыненні іншых англійскіх рамантыкаў. Ён вастрэй за многіх адчуваў безнадзейную неадпаведнасць рамантычных ідэалаў і рэчаіснасці...

**1927** год — адбыўся першы прамы радыёрэпартаж з футбольнага матча паміж «Арсеналам» і «Шэфілд Юнайтэд» у Лондане.